# Этнічныя канфлікты ў тэорыі

Сэмінар “Пагранічча. Сацыялягічныя дасьледаваньні”, які вядзе прафэсар Андрэй Садоўскі на Філіяле Варшаўскага ўнівэрсытэту, паволі мацуецца ў краявідзе навуковага і грамадзкага жыцьця ў Беластоку. У панядзелак 14 лютага на гэтым сэмінары выступіў прафэсар Гжэгаж Бабінскі, сацыёляг з Палянійнага інстытуту Ягелонскага ўнівэрсытэту ў Кракаве. Тэмай ягонага дакладу была “Этнічныя канфлікты”.

Дакладчык прадставіў тэарэтычныя падыходы да праблемы нацыяналізму і этнічных канфліктаў. Нацыяналізм ён схіляецца разумець як “стаўленьне дамаганьняў ад імя нацыі”, такім чынам як нешта не абавязкова адмоўнае. Ён падкрэсьліў прытым калектыўны характар нацыяналізму і яго актывістычны характар, у адрозьненьне ад нацыянальнай сьвядомасьці.

На думку прафэсара Бабінскага, нацыянальная дзяржава мусіць нараджаць канфлікты, а прынцып нацыянальнай самастойнасьці нарадзіў болей праблемаў, чымсьці іх вырашыў. Этнічных канфліктаў можна пазьбегчы, калі існуе супольная пагроза зь іншага боку, або знаходзяцца супольныя мэты. Наагул, у сучасным сьвеце, паводле дакладчыка, не існуе эканамічнай патрэбы этнічнай экспансіі, што памяншае пагрозу ўзьнікненьня канфліктаў.

У дыскусіі дакладчык выказаў сумненьне адносна магчымасьці прадухіленьня этнічных канфліктаў мэтадамі сацыятэхнікі. Вядома толькі, што такія канфлікты лягчэй выклікаць, чымсьці іх апанаваць. Прафэсар Бабінскі прынцыпова адмаўляўся ад нейкіх практычных прагнозаў адносна магчымасьці выбуху этнічных канфліктаў у нашым кутку Эўропы, сьцьвярджаючы бясьсільле навукі на гэтым полі. Як прыклад ён падаў свайго югаслаўскага сябра–прафэсара, які не ўяўляў сабе магчымасьці выбуху такога канфлікту ў ягонай роднай краіне.

Усё–такі прафэсар Бабінскі рызыкнуў выказаць тэзіс, што ў Польшчы найбольш напружаныя польска–нямецкія стасункі. Сытуацыю на Беласточчыне кракаўскі госьць бачыць як менш пагрозьлівую ды, безумоўна, хацеў бы, каб так і было, з увагі на сваю жонку–беларуску.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1994. 7 сакавіка. № 10. С. 4.